**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”**

Распрацавана і праведзена
настаўнікам пачатковых класаў Любінай
Аленай Аляксандраўнай
дзяржаўнай установы адукацыі
“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа
Ельскага раёна”

## Гістарычны экскурс

## “Падарожжа па сучаснай і старажытных сталіцах Беларусі”

**Мэта:**

- ✔ пазнаёміць са старажытнымі сталіцамі Беларусі, знакамітымі месцамі Беларусі;
- ✔ садзейнічаць развіццю мыслення, звязнай вуснай мовы;
- ✔ стварыць умовы для выхавання патрыятызму.

**Абсталяванне:** фотаздымкі Мінска, Навагрудка, Вільнюса, Полацка, прэзентацыя, аўдыёзапісы.

### Ход мерапрыемства

I. **Арганізацыйны этап.**
II. **Этап пастаноўкі тэмы і мэты мерапрыемства.**

Мой родны Мінск, табою ганаруся
Ты – волат, працаўнік, ты – прыгажун.
Ты – сэрца васільковай Беларусі
І першая струна ў сугуччы струн.
Чаргуюць вока гмахі-пабудовы,
Бібліятэкі дыямент запаланіў.
Пяшчотай боскаю ае мова –
На ёй мой дзед і прадзед гаварыў.
Спыняюся на плошчы Перамогі,
Прад помнікам схіляю галаву.
Сюды вядуць усе шляхі-дарогі.
Хвілінак колькі моўчкі пастаю.
Шукае хтосьці шчасце за мяжою –

Нікога не збіраюся судзіць.
А я ў бядзе і ў радасці з табою
Хачу імгненне кожнае пражыць!

- Сёння мы адправімся ў незвычайнае падарожжа – у прошлае і сучаснае нашай Радзімы. Мы пабываем у гарадах, якія ў розны час былі сталіцамі.

**III. Этап правядзення гістарычнага экскурса**

- Першы прыпынак у Віцебскай вобласці, у горадзе Полацку.
- Полацк – самы старажытны з беларускіх гарадоў. Упершыню ён упамінаецца ў 862 годзе. У летапісах сустракаюцца такія назвы: Полацеск, Полацекс, Полацьск.
- Давайце пройдзем па гэтым горадзе.

***Відыёфільм “Полацк”.***

- З Полацкам звязана ўзнікненне першай на нашых землях школы. Яе заснавальнікам лічыцца сын княгіні Рагнеды Ізяслаў. Ён пачаў збіраць і першую на Беларусі Бібліятэку. Гэта быў першы князь, якога пачалі называць Кніжнікам.
- Асветнікі – гордасць і галоўны скарб беларусаў. Сярод іх – першадрукар Францыск Скарына, які нарадзіўся ў Полацку. Тут яму пастаўлены помнік, адчынены музей тыпаграфіі. Вельмі шмат для развіцця беларускай і рускай пісьменнасці зрабіў Сімяон Полацкі.
- Сімвалам таленту нашага народа з’яўляецца Кірыла Тураўскі. Ён напісаў шмат пропаведзяў, малітваў, канонаў, у якіх заклікаў любіць адзін аднаго, апісаў прыгажосць прыроды.

**1 конкурс “Вякі не скарылі вучэнне Скарыны”.**

1. Яно нарадзілася,
   Але ніколі не памірае.
   Хто з ім пазнаецца,
   Ніколі ўжо не расстанецца (пісьменства).
2. Белае поле,
   Чорнае насенне,
   Хто яго сее,
   Той усё разумее.
3. Сам не ўмее ён нічога,
   А ў рукі калі ўзяць –
   Можа нам ён многа-многа
   Паказаць і расказаць.
4. У вадзе купалася,
   Ды сухой засталася.

Калісьці яе пер’е
Спрыяла вучэнню.

5. Не куст, а з лісточкамі,
Не кашуля, а пашыта.
Хто з ёю знаецца,
Той розуму набіраецца.
6. Кінь на камень –
Не разаб’ецца,
Кінь у ваду –
Дык расплывецца.

- Зараз Полацк невялікі, але вельмі прыгожы горад. Сюды прыязджаюць людзі на экскурсіі, святы пісьменнасці і духоўнай музыкі.
- Свята “Дзень беларускай пісьменнасці” праходзіла ў Полацку два разы (1994 г, 2003 г). У 2003 годзе адбылася важная падзея Дня беларускай пісьменнасці – адкрыццё ў горадзе помніка літары “Ў”.
- А вы добра ведаеце беларускую мову?

**2 конкурс “Назаві адным словам”.**

Пчала, жук, чмель.

Званочак, рамонак, васілёк.

Сукенка, спадніца, футра.

Заяц, воўк, мядзведзь.

Чаравікі, боты, туфлі.

Стол, шафа, ложак.

**3 конкурс “Наадварот”.**

Ранак, зіма, высока, цяжка.

Чысты, мяккі, ідзе, шырокі.

- Дык дзякуй, мой любімы край,
Што і ў мяне ёсць спадчына –
Зялёны стогалосы гай
І гэта мова матчына.

- А мы з вамі развітваемся з Полацкам і працягваем наша падарожжа.
- І вось мы ўжо ў Гродзенскай вобласці, у горадзе Навагрудку. Ён з’яўляецца больш маладым горадам, чым Полацк. Дата яго заснавання –

1044 год. Летапісныя назвы горада – Ноўгарад, Навагарадок, Ноўгарадок. Яго заснавальнікам быў сын полацкай княгіні Рагнеды і кіеўскага князя Уладзіміра Яраслаў Мудры. Праз два стагоддзі Навагрудак стаў сталіцай моцнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага.

- У Навагрудку размешчана Замкавая гара. Называецца яна так, таму, што на ёй калісьці стаяў замак. Сёння ад замка засталося толькі дзве вежы. Гэтыя вежы з’яўляюцца сімвалам горада. У горадзе ёсць будынкі, якія называюцца помнікамі. Над горадам узвышаюцца Барысаглебаўская і Мікалаеўская цэрквы, касцёл святога Міхаіла. Вельмі прыгожы Фарны касцёл. Побач з Замкавай гарой і недалёка ад гэтага касцёла ўзвышаецца курган Адама Міцкевіча, ёсць помнік паэту, Дом-музей. Напамінае пра Вялікае Княства Літоўскае возера Літоўка каля Навагрудка. Па дарозе на Баранавічы размешчана чыстае і вельмі прыгожае возера Свіцязь. Пра яго пісаў Адам Міцкевіч і многія іншыя паэты і пісьменнікі.
    - Між дрэў, бы ў вяночку, адкрыецца воку
    Там возера Свіцязь, як дзіва,
    Як быццам хто шыбіну лёду звысоку
    Сюды апусціў беражліва.

**4 конкурс “Знайдзі і закрэслі назвы птушак”**

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С | Я | Л | Ю | Ц | Е | Л | С | А | Р |
| А | В | А | З | Я | Ц | К | О | Л | О |
| О | Е | Л | Я | З | Я | Ш | Й | А | К |
| Д | Р | О | З | Д | Р | У | К | В | А |
| Л | А | С | Т | А | Ў | К | А | Е | Э |
| О | Б | І | Н | І | Ц | А | К | Й | С |
| Ч | Е | Л | У | К | Т | Ч | А | П | Л |
| А | Й | К | А | Б | Ж | К | З | Ш | Я |
| С | П | Ы | Ж | У | Р | А | В | Е | Л |
| Х | О | Р | Т | С | Е | Л | Е | І | Ь |

Сава, зязюля, цецярук, сарока, салавей, сойка, ластаўка, верабей, дрозд, сініца, чапля, шпак.

**5 конкурс “Нашы дрэвы”**

1. Самае салодкае дрэва нашага краю (ліпа).
2. Адзінае ў свеце дрэва з белай карой (бяроза).
3. Дрэва, якое асыпае зямлю “белым снегам” (тапаля).
4. Дрэва – лепшы ачышчальнік паветра (сасна).

5. Дрэва – плакса (іва).
6. Дрэва – запалкавая каралева (асіна).
7. Дрэва, якое расце ля Лукамор’я (дуб).
8. Казачная краіна, у якой можна вырасціць дрэва з манеткамі (Краіна Дурняў).

- Я гэты горад знаю з даўніх дзён,
  Дзе дрэмлюць замку гордыя руіны,
  Дзе ўзняў густое вецце ясень, клён
  Над сном акамянелым Гедыміна…
  І я чытаю пыльныя радкі,
  У якіх вітае светлы дух Скарыны,
  І ўстаюць мінулыя вякі
  І слаўныя краіны гадавіны.

- На наступным прыпынку мы пазнаёмімся з горадам, які па праве называюць калыскай беларускага адраджэння. Гэта горад Вільнюс – сучасная сталіца Літвы.
- Вільня была цэнтрам беларуска-літоўскай дзяржавы. Па многіх вуліцах і вулачках горада хадзілі тыя, кім ганарыцца Беларусь. Сярод іх Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч.
- У Вільні стварылі тыпаграфію, дзе твыдаваў свае кнігі Францыск Скарына. Гэта была першая друкаваная кніга. Скарына выдаў Біблію на старабеларускай мове, якая была дзяржаўнай мовай Вялікага княства Літоўскага, на ёй пісалі ўсе законы.
- А наступны наш прыпынак у сучаснай сталіцы Рэспублікі Беларусь. Мінск – сучасны эканамічны, культурны, палітычны цэнтр нашай Радзімы. Ён заснаваны ў 1067 годзе. У даўнія часы, калі Полацк быў вядомы далёка за межамі нашай Радзімы, гэта было невялікае мястэчка на мяжы Полацкай зямлі.
- Існуе некалькі легенд пра ўзнікненне горада. Адны вучоныя лічаць, што горад узнік на рацэ Менцы, якая працякае недалёка ад сучаснага Мінска. Таму яго гістарычнае імя Менск нагадвае назву “Менка”. Іншыя сцвярджаюць, што месцам узнікнення з’яўляецца вусце ракі Нямігі. Слядоў гэтых рэчак амаль не засталося. Цяпер жыццё мінска звязана са Свіслаччу, якая асабліва шырока разліваецца ў раёне Нямігі і траецкага прадмесця. Дакументы сведчаць, што першым князем тут быў Глеб Усяслававіч, сын легендарнага Усяслава Чарадзея, а Мінск доўгі час быў умацаваным пунктам на мяжы Полацкага княства. Паступова ён ператварыўся ў адзін з буйнейшых гарадоў Полацкай зямлі.

- У сучасным Мінску знаходзяцца самыя галоўныя ўстановы Рэспублікі. Тут працуе Прэзідэнт.
- Беларусы – працалюбівы і таленавіты народ. Нават за межамі нашай краіны вядомая прадукцыя мінскіх прадпрыемстваў – трактары “Беларусь”, тэлевізары “Гарызонт”, халадзільнікі “Атлант”, цукеркі фабрыкі “Камунарка”.

***Прагляд фільма пра Мінск.***

**6 конкурс “Перастаў радкі верша”**

Пушчы ды палеткі,

Расцвітаюць кветкі.

Беларусь – чароўны край,

На вясновых паплавах.

(Беларусь – чароўны край,

Пушчы ды палеткі,

На вясновых паплавах

Расцвітаюць кветкі.)

**7 конкурс “Эмацыянальнае чытанне”**

**8 конкурс “Скласці прыказкі”**

Той герой, хто за Радзіму гарой.

Радзіма любімая – маці родная.

Усякай птушцы сваё гняздо міла.

Усякаму міла свая старана.

**9 конкурс “Перакладчыкі”**

Карандаш, молодой, голубой, девочка, бежать.

Рисунок, красивый, красный, мальчик, любить.

**10 конкурс «Выправі памылкі”**

“Малако дае карова”, -

Напісаў на кошцы Вова.

Закрычаў Рыгорка:

“З неба ўпала горка!”

Назбіралася народу.

Дзіва, поўны вулей лёду.

Весела звініць збанок,

Кліча: “Дзеці на ўрок”.

Не праедзеш, дружа,

На дарозе ружа.

Кажа Славік Светцы:

“Цесна тыгру ў кветцы”.

**11 конкурс “Кветкавы”**

1. Каралева кветак (Ружа).
2. Кветкі, сабраныя ў пучок (Букет).
3. Дом садовых кветак (Клумба).
4. Кветка, выконваючая жаданні (Кветка-сямікветка).
5. Дзяўчынка з кветкі (Дзюймовачка).
6. Ярка –сінія пушыстыя кветачкі, якія растуць у жыце (Васількі).

**12 конкурс “Валошкавы”.**

1. Кветкі якіх раслін адлюстраваны на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь? (канюшына, лён)
2. Знайдзі лішняе: Віцебск, Орша, Бабруйск, Швецыя. (Швецыя).
3. Знайдзі лішняе: Віцьба, Лучоса, Дзвіна, Волга. (Волга)
4. Чаму Беларусь называюць сінявокай?
5. Назаві колеры беларускага сцяга (белы, чырвоны, зялёны)

6. Назаві гарады – сталіцы нашай краіны (Вільня, Навагрудак, Полацк, Мінск)

**13 конкурс “Беларусь”.**

**Б** – самая першая кніга вучняў (Буквар).

**Е** – навагодняе дрэва (елка).

**Л** – першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь (Лукашэнка А.Р.)

**А** – першая сталіца Беларусі (Полацк)

**Р** – самы вялікі на тэрыторыі сусед нашай краіны (Расія)

**У** – самая жаўтавокая змяя нашых лясоў – сімвал поспеху нашых продкаў (вуж)

**С** – знакаміты беларус – першадрукар (Скарына)

**Ь** – “другі хлеб” беларусаў (бульба)

IV. **Этап падвядзення вынікаў мерапрыемства**

- Наша падарожжа закончылася. Дзякуй усім за ўдзел!
- Беларусь – мая Радзіма,
  Край бярозак і дубоў.
  Край балотаў журавінных,
  Васількоў, баравікоў.
  Край крыніцаў цудатворных.
  І азёраў, і палёў.
  Ты – алзіны, непаўторны,
  Родны кут маіх бацькоў.
  Смех дзяцей блакітнавокіх,
  Запавет сівых дзядоў,
  Першых слоў і першых крокаў,
  Паясоў і ручнікоў!